# МЫ АДЗНАЧАЕМ ЮБІЛЕЙ!












Сціплыя каляровыя падшыўкі газеты «Мы і час» ляжаць у рэдакцыі заўсёды на відным месцы як вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў, якія робяць першыя крокі ў журналістыцы. Бывае, што і самі супрацоўнікі гартаюць пажоўклыя старонкі газеты, перш за ўсё тады, калі гутарка заходзіць пра якога-небудзь выпускніка, які высока падняўся па журналісцкай лесвіцы. Як ён пісаў у студэнцкія гады, якія праблемы ўздымаў, пра каго распавядаў?.. А такіх пазаштатных карэспандэнтаў было шмат. Можна доўга называць іх імёны і прозвішчы, і гэты спіс будзе даволі ўнушальным. Аднак, у першую чаргу, мяркую, трэба сказаць студэнтам малодшых курсаў і тым, хто яшчэ не ведае, пра тое, што ва ўніверсітэце газета існуе ўжо 20 гадоў, як і расказаць, з чаго ўсё пачалося.

А пачалося ўсё ў далёкім 1996 годзе, калі выйшаў першы нумар газеты «Наша жизнь», галоўным рэдактарам якой быў рэктар нашай ВНУ Віктар Ніканавіч Вінаградаў.

Нават памятаю, як у віцебскай друкарні вярстаўся той нумар. Рупіліся А.І. Мацяюн і Т.В. Катовіч – прафесійныя журналісты, адказныя за выпуск «Нашей жизни». У той дзень, будучы рэдактарам шматтыражкі «Кімавец», я таксама вярстала газету. Зірнула тады на палосы студэнцкага выдання і жахнулася: столькі было правак. Нават паспачувала Артуру Іосіфавічу і Тацяне Віктараўне: як жа ім нялёгка працаваць з аўтарамі-пачаткоўцамі. Тады я нават і не падумала, што праз сем гадоў сама апынуся на іх месцы і ўліюся ў імклівае студэнцкае жыццё. Буду разам з юнакамі і дзяўчатамі рыхтаваць новыя выпускі газеты, дапамагаць ім спасцігаць таямніцы журналісцкага майстэрства.

2003 год. Мяне назначылі на пасаду рэдактара газеты. Праз два тыдні «Наша жизнь» за нумарам 14 ужо пабачыла свет. Потым былі клопаты ў афармленні дакументаў для рэгістрацыі выдання ў Міністэрстве інфармацыі, пошукі трапнай назвы, якая б стала сугучнай і моладзі і часу, арганізацыя падпіскі. Тут шчыры дзякуй трэба сказаць прарэктару па выхаваўчай рабоце Ірыне Васільеўне Бондал, супрацоўнікам аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю (начальнік Алена Волкава). Асобныя словы падзякі, безумоўна, і прарэктару па вучэбнай рабоце Веславу Іосіфавічу Туркоўскаму, які заўсёды клапоціцца пра падпіску.

Сказаць, што нялёгка было працаваць са студэнтамі першыя гады, – нічога не сказаць. Але дзякуючы галоўнаму рэдактару, рэктару Аркадзю Уладзіміравічу Русецкаму, сённяшняму галоўнаму рэдактару Іне Міхайлаўне Прышчэпа, дэкану факультэта беларускай філалогіі і культуры Віктару Іванавічу Несцяровічу, начальніку рэдакцыйна-выдавецкага аддзела ўніверсітэта Артуру Іосіфавічу Мацеюну, дырэктару навуковай бібліятэкі Але Міхайлаўне Міцкевіч, інжынеру цэнтра інфармацыйных тэхналогій Фёдару Аляксеевічу Грынеўскаму, супрацоўніку міжнароднага аддзела, а пасля і карэспандэнту Фёдару Іванавічу Шкірандзе газета «Мы і час» з кожным годам мацнела і станавілася любімым выданнем для машэраўцаў.

У рэдакцыі няшмат узнагарод, але лічу, што гэта не самае галоўнае ў працы калектыву. Важна тое, што газета стала рупарам і праваднікам ідэй нашай навучальнай установы, а інфармацыйная палітыка ўніверсітэта, дзякуючы «Мы і час», ажыццяўляецца сёння паспяхова і ў поўнай меры. Самая важная, на мой погляд, функцыя, якую выконвае газета, – навучальная. У рэдакцыі студэнты праходзяць практыку на працягу ўсяго года. Гэта вельмі адказная работа для супрацоўнікаў газеты. Відавочна, якія б ні былі лекцыі, тэорыя без практыкі мёртвая.

У гэтым нумары газеты мы далі магчымасць нашым выпускнікам, якія працуюць у СМІ і не толькі, падзяліцца ўспамінамі і ўражаннямі ад супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Спадзяёмся, што сваімі аповедамі яны пераканаюць студэнтаў-філолагаў, якія мараць стаць карэспандэнтамі, у тым, што газета «Мы і час» – унікальны шанец набыць прафесійны вопыт журналіста і рэалізаваць свае творчыя здольнасці. У гэтым ім дапамогуць супрацоўнікі рэдакцыі: выпускніца ФБФК, карэспандэнт Алеся Дуброўская, выпускніца ФБФК, кандыдат філалагічных навук, карэктар Таццяна Дубоўская, выпускніца ГФ, рэдактар Лізавета Петухова (Трушчанка), якая цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. Да кожнага, хто завітае ў рэдакцыю, дзяўчаты аднясуцца з цеплынёй і паразуменнем, дапамогуць, параяць.

Безумоўна, мне як рэдактару хацелася б яшчэ больш падпісчыкаў і пазаштатных аўтараў. Таму я раю студэнтам і супрацоўнікам нашай ВНУ, а таксама выпускнікам мінулых гадоў не губляць сувязь з універсітэтам і падпісацца на газету «Мы і час». Не такія ж ужо і вялікія грошы трэба аддаць, каб атрымліваць два разы на месяц выданне і быць у курсе ўсіх спраў і падзей, якія адбываюцца не толькі ў сценах ВДУ, але і ў горадзе, вобласці, рэспубліцы.

А зараз дазвольце ўсіх нас павіншаваць з 20-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара газеты. А яе заснавальнікаў В.Н. Вінаградава і А.У. Русецкага яшчэ і з Днём народзінаў, які яны адзначылі ў пачатку лістапада. Пажадаць шаноўным рэктарам здароўя, даўгалецця, а нашаму выданню – росквіту, таленавітых студэнтаў, захапляльных матэрыялаў і ўнушальнага тыражу.

**Настасся ЛАЗЕБНАЯ,**
**рэдактар газеты,**
**член Саюза журналістаў СССР,**
**член Беларускага саюза журналістаў.**

**На здымках:** супрацоўнікі, сябры і пазаштатныя аўтары рэдакцыі.

**Фота з архіва рэдакцыі.**